CORE Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk



**УДК 393.05 + 392.14 + 392. 51 (476) “192”**

# МАЛАДОСЦЬ У ВУСНАЙ БІЯГРАФІІ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ (ПАВОДЛЕ ІНТЭРВ’Ю З ІНФАРМАНТАМІ 1920-30-х ГАДОЎ НАРАДЖЭННЯ)

***канд. гіст. навук, дац. А.Б. ЗАХАРЭВІЧ***
**Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск**

*Разглядаецца катэгорыя маладосці, аналізуецца ўплыў на яе успрыманне асабістага вопыту і агульных уяўленняў інфармантаў. Даследаванне заснавана на матэрыялах інтэрв’ю з жыхарамі Беларускага Падзвіння 1920–30-х гадоў нараджэння.*

Трэба адзначыць, што размова пойдзе пра перыяд юнацтва, які паводле карэнных змен у натуральнай прыродзе чалавека Г.П. Арлова вызначае як перыяд ад 14 да 16–21 года (па сутнасці да вяселля) [1, с. 89]. Бо калі на вяселлі жаніх і нявеста яшчэ “маладыя”, то пасля вяселля мінае яшчэ год, нараджаецца дзіця, і яны ўжо канчаткова пераходзяць ў катэгорыю дарослых.

Адным з асноўных метадаў даследавання моладзевай культуры з’яўляецца інтэрв’ю. Па-першае, даная тэма не з’яўляецца траўматычнай, як, напрыклад, голад, і інфарманты звычайна з вялікім задавальненнем распавядаюць пра часы сваёй маладосці, бо маладосць бачыцца ці не самым светлым перыядам у жыцці. Пошук шлюбнай пары, заляцанні, вечарынкі, пасля – шлюб, не заўсёды ўдалы, ды цяжкая праца па гаспадарцы. Аднак з другога боку інфарманты часта “не лічаць сваё жыццё дастаткова цікавым для іншых людзей, не лічаць яго вартым пераказа. З пункту гледжання інфармантаў, жыццё, пра якое можна расказваць, павінна быць унікальным, у той час, як уласнае жыццё ім унікальным не падаецца” [2].

Кожны чалавек успрымае навакольны свет у адпаведнасці са сваімі ўяўленнямі пра яго і ў залежнасці ад папярэдняга вопыту. Такім чынам, успаміны чалавека ўжо першапачаткова складаюць не “чыстыя факты”, а яго ўласную інтэрпрытацыю падзей, і падзяліць гэтыя два элементы практычна немагчыма [3, с. 20]. Тое, што памяць – гэта рэканструкцыя, аднаўленне расказа пра тую ці іншую падзею ў нашым жыцці, пераканаўча давёў псіхолаг з Кембрыджу Фрэдэрык Бартлет [4].

Прынцып “усе павінны працаваць” быў галоўным у жыцці беларусаў. Таму асноўная тэма, якая чырвонай ніткай праходзіць праз апавяданні большасці інфармантаў – гэта тэма цяжкай паўсядзённай працы. Трэба адзначыць, што беларусы пачыналі прывучаць дзяцей да працы з 4–5 год. Гэта было звязана з перакананнем беларусаў у тым, што вартасць чалавека вызначаецца перш за ўсё па яго адносінах да працы і з тым, што да вяселля хлопцы і дзяўчаты павінны былі навучыцца рабіць усё неабходнае па гаспадарцы. Такім чынам, маладосць для большасці – гэта перш за ўсё праца: “Я пайшла работаць у 15 гадоў. 2 гады работала ў звяне, лён вырашчывалі. А тады ў 17 гадоў пайшла на ферму работаць. І труд быў не цяперашні, нада было ўсё самім: кармілі, самі кармы запарывалі, убіралі ў сараях, даілі. Цэлы дзень мы на гэтай ферме не выхадзя!”[1].

Яшчэ адна тэма – гэта беднасць. Беднасць была выклікана складанай сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй у рэгіёне і ў краіне ў цэлым, а таксама ваенным ліхалеццем. Большасць сем’яў знаходзілася ў цяжкім матэтыяльным становішчы і амаль ад кожнага інфарманта можна пачуць, што не было грошай на тое, каб атрымаць адукацыю, не было чаго апрануць і г.д.: “Гэта ўжо бальшэй празнік – матка купіць туфлікі. Дык ты ідзеш на вечарынку, туфлі ў руках нясеш, ідзеш назад з мальцам – туфлі ў руках. Мне б тая адзежа, што сейчас у мяне, ды дзеўке! На работу ідзеш у плацці, прыйдзеш з работы, памыеш, уцюгом паўцюжыш. У чым на рабоце быў, у тым на танцы ідзеш”[2]. Сукенкі перашывалі на новую моду (тканіна тая самая, а сукенка быццам бы новая), фарбавалі даматканае палатно таблеткамі, хусцінкі рабілі з парашута, які брат прынёс з войска, і г.д. Былі, канешне, выпадкі, калі сям’я была заможная: “Сястрэ было 16 лет, папачка ж купіў ей пальто асеняе карычневае і шляпу з цвятамі, каб ягоная дачушка было ўжо красівая. У яго было чацьвёра лашадзей, пяць кароў, і пяцёра дзяцей, а нас баба ўсё даглядала і гнала на поле работаць! Пры Польшчы адзеваліся, патаму што многа лёну насевалі, ну і скот здавалі. Пры Польшчы мы як пан Быкоўскія хадзілі (смяецца, – *А.З.*).”[3].

Аднак побач з гэтымі “негатыўнымі” тэмамі ідзе тэма пошуку шлюбнай пары і баўлення вольнага часу: “А ўсё раўно весела было. На танцы хацелася схадзіць, і ў самадзейцельнасці ўчаствавалі. Цяпер,

[1] Запісана аўтарам у 2016 г. ад Усцінавай Валянціны Трафімаўны, 1939 г.н., у г. Наваполацк (нарадзілася і жыла да 1986 г. у в.Зуі Полацкага р-на).
[2] Запісана аўтарам у 2008 г. ад Балуцінай Еўфрасінні Афанасьеўны, 1921 г.н., на ст. Княжыца Віцебскага р-на.
[33] Запісалі Бугаевіч Руслан, Захарэвіч Ала, Шрубок Аляксандра ў 2014 г. ад Неміроўскай Альдоны Дзмітрыеўны, 1931 г.н., у агр. Узмёны Мёрскага р-на.

мне кажэтся, скучна. Мы самі пелі. Гармошка, скрыпкі, цымбалы. Танцы очэнь легко танцаваць пад скрыпку з цымбаламі. Дзярэўня бальшая была – большэ ста двароў. Танцы былі – субота, васкрасення ілі празнік які"[4]; "Вясёла, смешна і радасна было. Нейкія людзі былі, як вам сказаць, такая обшчая дзярэўня была, адзін аднаму памагалі. На поле, як жніво, каб вы паслухалі! Па ўсіх старонах песні. У гэтай дзярэўні пяюць, у гэтай, у гэтай"[5].

Падчас апавяданняў закранаюцца пытанні моладзевага этыкету, службы ў войску і многія іншыя. Аднак агульным для іх з'яўляецца тое, што для адказаў інфармантаў характэрныя ідэалізацыя і жаданне паказаць тую ці іншую з'яву ў больш выгадным святле. Гучаць супрацьпастаўленні "тады" і "цяпер", прычым звычайна яны не на карысць апошняга.

Тэма вайны гучыць амаль у кожным інтэрв'ю, бо яна закранула амаль кожную сям'ю, раны, нанесеныя вайной, не зацягнуліся і сёння. Аднак у большасці выпадкаў інфарманты закранаюць тэму вайны не ў сувязі з маладосцю, а як асобную, самадастатковую тэму.

Таксама для інтэрв'ю характэрны пераход інфарманта ад асабістага да агульнага. Інфармант адчувае сябе часткай грамадства, дзе было прынята адно і было забаронена другое. Таму перыядычна падчас апавядання ён падмяняе асабісты вопыт агульным уяўленнем пра праблему (расказвае, не пра тое, што было з ім, а пра тое, што было прынята). На расказ ўплываюць ўяўленні інфарманта аб тым, як павінна быць: вось інфарматарка распавядае, як яе бацька адлупцаваў рамнём за тое, што яна адрэзала касу, а пасля, напэўна, падумаўшы, што біць дзяцей нельга і гэтак далей, пераводзіць размову на тое, што насамрэч у тым, што здарылася, вінаватая сяброўка, бо падгаварыла, ды і яна сама, бо не падумала[6].

Такім чынам, у апавяданнях старых людзей пра маладосць можна вылучыць некалькі агульных, найбольш значных тэм, а таксама можна зрабіць вывад пра немагчымасць запісу падчас інтэрв'ю "чыстых фактаў": на ўспаміны абавязкова ўплывае вопыт, погляды чалавека, маральныя нормы і каштоўнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск : Народная асвета, 1993. – 120 с.: іл.
2. Мельникова, Е. Однажды, в студеную зимнюю пору… [Электронны рэсурс] / Е. Мельникова // Русский журнал. – Рэжым доступу: http://magazines.russ.ru/nz/2010/5/me11-pr.html. – Дата доступу: 30.03.2016.
3. Лоскутова, М.В. Введение / М.В. Лоскутова // Хрестоматия по устной истории / пер., сост., введение, общ. ред. Лоскутовой М.В. – СПб., 2003. – С. 5–31.
4. Классические исследования организации памяти [Электронны рэсурс] // ПостНаука. – Рэжым доступу: http://postnauka.ru/video/56050. – Дата доступу: 30.03.2016.

## YOUTH IN THE ORAL BIOGRAPHY OF RESIDENTS OF BELARUSIAN PADZVINNIE (ON THE BASIS OF INTERVIEW WITH INFORMANTS OF THE 1920-30TH YEAR OF BIRTH)

***A. ZAKHAREVICH***

*The author considers the category of youth, analyses the impact on it perception of personal experience and general people's ideas. The article is based on interview with informants of the 1920–30th year of births.*

Polotsk

[4] Запісана аўтарам у 2016 г. ад Усцінавай Валянціны Трафімаўны, 1939 г.н., у г.Наваполацк (нарадзілася і жыла да 1986 г. у в.Зуі Полацкага р-на).
[5] Запісана аўтарам у 2009 г. ад Беззубёнак Марыі Феліксаўны, 1926 г.н., у в. Празарокі Глыбоцкага р-на.
[6] Запісана аўтарам у 2009 г. ад Беззубёнак Марыі Феліксаўны, 1926 г.н., у в. Празарокі Глыбоцкага р-на.